Источник: "Беларуская думка" - №3, 2016-03-18



# Міжваенная беларусізацыя і яе ўрокі

## Дзяржаўная моўная палітыка ў БССР у 1920–1930-я гады

**Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі не ўнесла якіх-небудзь карэнных перамен у моцна дэфармаванае нацыянальнае жыццё беларускага народа. А такія перамены абавязкова павінны былі адбыцца. У высокіх эшалонах дзяржаўнай улады Савецкай Расіі, яе партыйных органах працавала нямала адукаваных асоб, якія не маглі не ведаць, што, нягледзячы на культурна-моўную блізкасць да рускіх, беларусы з'яўляюцца арыгінальным, самабытным народам.**



**Леанід ЛЫЧ, доктар гістарычных навук, прафесар**

Пра адрознасць беларусаў ад іншых славянскіх народаў нямала было сказана да рэвалюцыі аўтарытэтнымі навукоўцамі Расіі, а таксама іншых краін. Таму савецкія дзяржаўныя і партыйныя дзеячы павінны былі паклапаціцца пра стварэнне неабходных умоў для нармальнага нацыянальнага развіцця беларускага народа. Але ж прыняты 15 лістапада 1917 года прагрэсіўны ва ўсіх адносінах канстытуцыйны акт савецкага ўрада «Дэкларацыя правоў народаў Расіі» абмінуў беларусаў. Дэкларацыя абвяшчала роўнасць і суверэннасць усіх народаў Расіі, іх права на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы, адмену ўсіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў. І гэта ўжо ў першыя дні і месяцы пасля Кастрычніка 1917 года пачыналі адчуваць на сабе некаторыя народы. Беларусам жа, што жылі ў межах Савецкай Расіі, ніхто не збіраўся даваць не толькі палітычнай, але і нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Яны, як і раней, уваходзілі ў створаную ў маі 1917 года Заходнюю вобласць, накшталт Паўночна-Заходняга краю царскай Расіі. Толькі цяпер, акрамя Віленскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў, у яе склад была ўключана і Віцебская. На афіцыйным узроўні пытанне аб укараненні беларускай мовы ў грамадскае жыццё не ўзнімалася, і ў немалой ступені таму, што на чале партыйнай і савецкай улад Заходняй вобласці стаялі пераважна асобы не беларускай нацыянальнасці, да таго ж яшчэ некаторыя з іх не мясцовага паходжання. Аднак пасля абвяшчэння 1 студзеня 1919 года Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь прынцыпова інакш пачалі на дзяржаўным узроўні глядзець на нацыянальныя правы беларусаў. У гэтым трэба бачыць і вялікую палітычную заваёву, і цалкам заслужаную юрыдычную абгрунтаванасць, бо беларусы на працягу многіх стагоддзяў прыстойна сцвярджаліся ў статусе дзяржаўнага народа і страцілі яго не ў выніку няздольнасці надалей заставацца такім, а толькі з-за неспрыяльнага геапалітычнага становішча, выкліканага захопніцкімі дзеяннямі царскай Расіі.

Кожны дзяржаўны народ, калі ён хоча заставацца такім, павінен, як сведчыць сусветная практыка, развівацца на ўласнай нацыянальна-культурнай, моўнай глебе. Гэтага не маглі не ведаць айцы Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і

### ПРА АЎТАРА

ЛЫЧ Леанід Міхайлавіч.
Нарадзіўся ў 1929 годзе ў вёсцы Магільнае Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. У 1957 годзе скончыў Башкірскі педагагічны інстытут. У 1957–1962 гадах працаваў настаўнікам у школах Беларусі. З 1962 года – у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.
Доктар гістарычных навук (1989), прафесар (1993).
Аўтар больш як 500 навуковых работ, у тым ліку 25 манаграфій.
Асноўныя напрамкі даследаванняў: пытанні сацыяльна-класавых адносін у савецкі час, гісторыя беларускай культуры, моўная палітыка ў Беларусі ў XIX–XX стагоддзях, міжнацыянальныя адносіны ў Беларусі ў XX стагоддзі.

Источник: "Беларуская думка" - №3, 2016-03-18



найперш сам старшыня Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, да таго ж яшчэ пісьменнік, Зміцер Жылуновіч (літаратурны псеўданім – Цішка Гартны). Гэта яму беларусы абавязаны з'яўленнем на свет Маніфеста аб абвяшчэнні БССР на беларускай мове.

Ужо само надрукаванне гэтага гістарычнага акта па-беларуску сведчыла, што наша мова рана ці позна вызваліцца з запрыгоненага царызмам стану. У першыя ж дні існавання БССР рэй у службовым справаводстве вяла руская мова, бо роднай мовай тытульнага народа не валодала абсалютная большасць чыноўнікаў усіх рангаў. Але калі які-небудзь важны дзяржаўны дакумент быў падрыхтаваны на рускай мове, ён абавязкова перакладаўся на беларускую мову.

У створанай у лютым 1919 года Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы (ЛітБел), акрамя беларускай, афіцыйнымі мовамі з'яўляліся літоўская, руская, польская. Роля беларускай мовы ў абслугоўванні службовага справаводства была вельмі нязначнай. Уладам было не да вырашэння моўнага пытання, бо ўвесь час існавала рэальная пагроза захопу з боку польскіх інтэрвентаў, якім усяляк дапамагалі вядучыя дзяржавы Захаду.

Хоць і не так хутка, але ўсё ж сацыяльнае становішча беларускай мовы пачало істотна паляпшацца пасля прыняцця 31 ліпеня 1920 года Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь. Пытанне беларускай мовы стала вельмі часта выносіцца на абмеркаванне высокіх дзяржаўных і партыйных органаў, бо ў іх меўся цвёрды намер як мага хутчэй зрабіць яе фактычна і юрыдычна дзяржаўнай мовай нават нягледзячы на неўнармаванасць апошняй, слабае валоданне ёю абсалютнай большасцю савецкіх, партыйных чыноўнікаў. Лічылася, што ўсё гэта паспяхова пераадолееца ў ходзе практычнай дзейнасці, няхай сабе і праз мноства памылак і няўдачных спроб.

Упершыню з усёй катэгарычнасцю і выразнасцю было заяўлена пра неабходнасць арганізацыі дзяржаўнага і грамадскага жыцця Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі на роднай мове народа, які даў назву самой дзяржаве, у снежні 1920 года на II Усебеларускім з'ездзе Саветаў, а затым у лютым 1921 года на II сесіі Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР. Адзін з пунктаў (№ 4) рэзалюцыі з'езда па дакладзе аб народнай асвеце меў такую дырэктыўнага парадку фармулёўку: «Стварэнне сеткі ўстаноў, якія ўсебакова абслугоўваюць культурныя патрэбы масаў на ўсіх мясцовых мовах, падрыхтоўка для іх работнікаў асветы, выданне для іх літаратуры на мясцовых мовах і прыцягненне максімуму камуністычных сіл да гэтай працы» *[1, с. 126]*.

Яшчэ далей у гэтым адраджэнскім напрамку пайшла II сесія ЦВК БССР, на якой былі ўхвалены даволі эфектыўныя для таго часу практычныя мерапрыемствы па правядзенні нацыянальнай палітыкі. Разглядаючы пытанне аб мясцовых мовах, ЦВК БССР прадпісаў: «Наркамасветы зрабіць захады да ўмацавання працы на мове пераважнай большасці працоўнага сялянства Беларусі – мове беларускай. Наркамасветы павінен у сваёй працы зыходзіць з няўхільнай перспектывы планамернага і паступовага пераходу ўстаноў, у якіх навучаюцца і выхоўваюцца дзеці-беларусы, на іх матчыну беларускую мову выкладання. За выкананне гэтага задання павінны ўзяцца яшчэ ў бягучым годзе» *[1, с. 126–127]*, г.зн. у 1921 годзе.

Руху беларускай мовы ў цэнтр дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў многім паспрыялі прынятыя на X (сакавік 1921 года) і XII (красавік 1923 года) з'ездах РКП(б) прагрэсіўныя рэзалюцыі – «Аб чарговых задачах партыі ў нацыянальным пытанні» і «Па нацыянальным пытанні». Гэта яскрава вынікае з рэзалюцый VII з'езда (XII партканферэнцыя) КП(б)Б, што праходзіў у сакавіку 1923 года і быў прысвечаны разгляду нацыянальнага пытання. На з'ездзе адзначалася: «Камуністычная партыя ў поўнай адпаведнасці са сваёй праграмай у галіне нацыянальнага пытання павінна зрабіць усе захады да наладжвання працы на беларускай мове, ствараючы нармальныя ўмовы для развіцця беларускай культуры», «кіраўніцтва гэтай працай павінна быць ускладзена на партыйныя арганізацыі у цэлым як у цэнтры, так і на месцах». Вельмі каштоўным палажэннем рэзалюцыі было ўказанне на тое, што працэс пашырэння ўплыву беларускай культуры неабходна ўвязваць «з наяўнасцю дастаткова падрыхтаваных, класава-выхаваных і рэвалюцыйна-вытрыманых работнікаў» *[2, с. 96]*, бо ў асяроддзі кіруючага апарату розных сфер дзяржаўнага і грамадскага жыцця

Источник: "Беларуская думка" - №3, 2016-03-18





рэспубліці было нямала людзей, якія ў сваёй паўсядзённай практычнай дзейнасці на законныя нацыянальныя правы беларускага народа глядзелі з пазіцый велікарускага дзяржаўнага шавінізму. Без рашучага пераадолення такіх нездаровых, шкодных настрояў сярод работнікаў рэспубліканскага дзяржаўнага і партыйнага апаратаў, а таксама і кіраўнікоў усіх астатніх звенняў нельга было спадзявацца на дасягненне жаданага поспеху ў нацыянальна-культурным развіцці Беларусі.

Дзяржаўныя і партыйныя органы БССР з вялікай адказнасцю ставіліся да наладжвання нацыянальна-беларускага жыцця ў войску. У адпаведнасці з праведзенай ЦК РКП(б) у пачатку чэрвеня 1923 года ў Маскве нарадай па нацыянальным пытанні, у якой бралі ўдзел і прадстаўнікі ад ЦК КП(б)Б, рэспублікам дазвалялася ствараць свае нацыянальна-вайсковыя часці. Ужо ў ліпені таго ж года была сфарміравана Беларуская міліцыйная дывізія. У яе з усяго Савецкага Саюза выклікаліся ваенныя спецыялісты паходжаннем з Беларусі. Неадкладна з вайскоўцамі пачало наладжвацца праходжанне службы з улікам нацыянальных асаблівасцей краю, што аблягчалася даволі паспяховай працай Тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта ў распрацоўцы беларускай вайсковай тэрміналогіі. У 1927 годзе ў Мінску была выдадзена першая частка «Практычнага беларускага вайсковага слоўніка» М. Байкова і А. Бараноўскага. Высокую ацэнку праведзенай працы па перакладзе праваахоўных органаў і войска на нацыянальныя рэйкі дала нарада ЦК КП(б)Б з павятовымі партыйнымі арганізацыямі (кастрычнік 1923 года). Галоўным пытаннем на ёй было нацыянальнае. У матэрыялах нарады адзначалася: «Знаходзячуюся на тэрыторыі Беларусі міліцыйную дывізію лічыць базай для сфарміравання беларускай нацыянальнай часцыны… Папоўніць камандны й палітычны склад дывізіі беларусамі, знаючымі беларускую мову. Укомплектаваць дывізійную школу мясцовымі ўраджэнцамі і ўвесьці ў школу выкладанне мясцовых моваў і камандаваньне ў беларускай мове. У далейшым лічыць патрэбным перабудаваньне 6-х пяхотных курсаў у школу каманднага складу мясцовай беларускай вайсковай часьціны. Згодна з гэтым перафармаваць курсы па моўнаму і нацыянальнаму прызнакам. Паступова, на працягу году перавесці ўсе органы Нарваенкамату на беларускую мову ў пісьменных і ваенных зносінах» *[3, с. 239–240]*.

Хоць задума гэтая ў сваёй аснове надзвычай важная, а ў дачыненні да беларускага інтарэсу проста высакародная, аднак, як высветлілася на практыцы, тэрмін для яе выканання быў вызначаны нерэальны, занадта кароткі. Таму з розных рэгіёнаў СССР не ўдалося адклікаць патрэбную колькасць ваенных спецыялістаў беларускай нацыянальнасці, а нямала камандзіраў, што служылі на тэрыторыі Беларусі і не паходзілі з яе карэннага насельніцтва, наўмысна выказвалі пасіўнасць, а часам нават пад усялякімі падставамі тармазілі ўсталяванне нацыянальнага аспекту ў войску. З падобнымі негатыўнымі з'явамі дзяржаўныя і партыйныя ўлады вялі рашучую барацьбу, што дапамагала войску набываць так неабходныя яму рысы беларускасці. У яе рэчышчы актыўна працаваў ураджэнец Калужскай губерні будучы Маршал Савецкага Саюза Георгій Жукаў: займаючы дастаткова высокія пасады камандзіра палка, затым – дывізіі, ваенна-дапрызыўную падрыхтоўку ў БДУ ён выкладаў на беларускай мове *[4, с. 75]*.

Яскравыя прыклады свядомага дзяржаўнага ўмяшання ў моўную сферу прыпалі на ліпень 1924 года, калі праходзіў пленум ЦК КП(б)Б. У яго рэзалюцыю былі ўнесены многія не састарэлыя і для нашых дзён палажэнні. Так, пленум прызнаў ненармальным, што ў краіне беларуская нацыянальнасць з'яўляецца пераважнай па колькасці жыхароў, а яе «мова да гэтага часу мае вельмі абмежаванае распаўсюджанне ў дзяржаўных, грамадскіх і прафесійных установах і арганізацыях»; падкрэслівалася: «трэба стварыць умовы, якія найбольш спрыялі б развіццю і выкарыстанню беларускай мовы з тым, каб з фармальна раўнапраўнай зрабіць яе фактычна раўнапраўнай мовай, якая б заняла належнае месца ў Беларускай Рэспубліцы… У мэтах папулярызацыі і ўкаранення беларускай мовы ў зносіны паміж працоўнымі, усе члены партыі, якія валодаюць беларускай мовай, павінны пры сваіх выступленнях ужываць пераважна беларускую мову». Прызнаўшы раўнапраўнымі беларускую, рускую, яўрэйскую і польскую мовы, пленум ЦК КП(б)Б выказаўся за тое, што перавагу ўсё ж трэба аддаваць бела-

Источник: "Беларуская думка" - №3, 2016-03-18





рускай. Валоданне ёю, а таксама рускай мовай прызнавалася абавязковым для ўсіх супрацоўнікаў савецкіх прафесійных і грамадскіх арганізацый і ўстаноў, а некаторыя па роду службы павінны былі ведаць яшчэ яўрэйскую, польскую, украінскую і латышскую мовы. Пры адсутнасці такіх ведаў нельга было працаўладкоўваць на некаторыя пасады. Толькі ў выключных выпадках дазвалялася залічваць такіх асоб на працу тэрмінам на шэсць месяцаў. Усе дакументы агульнасаюзнага значэння рэкамендавалася выдаваць на беларускай і рускай мовах. Пераклад службовага справаводства на беларускую мову ў першую чаргу павінны былі ажыццяўляць тыя ведамствы, дзейнасць якіх непасрэдна датычыць беларускага насельніцтва *[5, с. 3–5]*.

З прыведзенымі патрабаваннямі шмат у чым пераклікаліся палажэнні прынятай 15 ліпеня 1924 года пастановы ЦВК БССР «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі». Згодна з ёй, раўнапраўнымі ў рэспубліцы прызнаваліся чатыры асноўныя мовы: беларуская, руская, яўрэйская і польская. Разам з тым адзначалася, што «з прычыны значнай перавагі ў БССР насельніцтва беларускай нацыянальнасці беларуская мова выбіраецца як мова зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі». Мовай жа зносін органаў БССР з органамі СССР і саюзных рэспублік прызнавалася руская *[6, с. 108]*.

Выпрацаваны дзяржавай курс на беларусізацыю падтрымалі не толькі афіцыйныя асобы: чыноўнікі, ідэолагі, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, але і звычайныя людзі, бо гэта цалкам адпавядала іх спрадвечным законным спадзяванням. Калі ж дзе-небудзь на моўнай глебе ўзнікалі канфлікты, яны пераадольваліся не адміністрацыйнымі метадамі, а праз удумлівую растлумачальную працу з насельніцтвам. А па сутнасці сур'ёзных, сапраўдных канфліктаў і не назіралася. У гэтам вельмі вялікую ролю адыграў такі аўтарытэтны дзяржаўны орган, як Камісія ЦВК БССР па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Аналагічныя камісіі існавалі пры акруговых выканаўчых камітэтах, якія ў сваёй дзейнасці абапіраліся на шырокія масы людзей, чым беларусізацыі забяспечваўся ў адначассе і дзяржаўны, і грамадскі характар.

Беларусізацыя ўражвала сваімі пазітыўнымі вынікамі. У 1927 годзе ўжо 80 % агульнай колькасці супрацоўнікаў цэнтральных (рэспубліканскіх) устаноў валодала беларускай мовай. У акруговых і раённых установах гэты паказчык склаў 70 %. У службовым справаводстве беларуская мова самыя моцныя пазіцыі мела ў апаратах ЦВК і СНК БССР, наркаматах асветы і сельскай гаспадаркі. Зразумела, у гэтым ім ніколькі не ўступаў ЦК КП(б)Б як галоўны ідэалагічны орган дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі. Актыўна падтрымала беларусізацыю і шмат карыснага зрабіла навуковая інтэлігенцыя. Сярод яе самых выбітных асоб практычна не знайсці нікога, хто б засумняваўся ў мэтазгоднасці перакладу навукі на беларускую мову і ў праве апошняй абслугоўваць гэтую самую складаную, прэстыжную сферу дзейнасці чалавека.

Выключна высокую адказнасць перад дзяржаўнай палітыкай беларусізацыі праявіла педагагічная інтэлігенцыя, галоўным чынам тая яе частка, што атрымала прафесійную адукацыю ў савецкіх навучальных установах. Не болей як за 5 гадоў была створана ў поўным сэнсе слова нацыянальная сістэма адукацыі, пабудаваная на адпаведных тытульнаму насельніцтву гістарычных традыцыях, культурна-моўнай аснове. Пад канец 1920-х гадоў усё ў меншай ступені назіраліся выпадкі нязгоды прафесарска-выкладчыцкага складу з перакладам педагагічнага працэсу вышэйшых навучальных устаноў на беларускую мову. Прычым нярэдка педагогі небеларускай нацыянальнасці неабходнасць такога пераходу разумелі глыбей і больш ахвотна згаджаліся на яго, чым іх абрусеелыя калегі з ліку карэннага насельніцтва. Без перабольшання, дзяржаўная палітыка беларусізацыі зрабіла (толькі шкада, што на вельмі сціслы тэрмін) адукацыю магутным этнаўтваральным фактарам. У сценах сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў рыхтаваліся не проста маладыя пакаленні спецыялістаў, а сапраўдная беларуская нацыянальная інтэлігенцыя. Такое было ўпершыню ў нашай айчыннай гісторыі.

У тое, што ў выніку беларусізацыі Беларусь стане беларускай, не верылі толькі адпетыя скептыкі. А вось калі дзяржава ў канцы 1920-х гадоў спінай павярнулася да свайго тварэння – беларусізацыі, да тых скептыкаў сталі небеспадстаўна далучац-

Источник: "Беларуская думка" - №3, 2016-03-18






9

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ.

ПРОГРАМА ПРАЦЫ АКАДЭМІЧНАЙ КОНФЭРЭНЦЫІ ПА РЭФОРМЕ беларускага правапісу і азбукі.

Нядзеля 14 лістапада
а 7 гадз.
Урачыстае адчыненьне Конфэрэнцыі.
У клюбе Карла Маркса.

Панядзелак 15 лістапада:
Уранні ад 10—2 гадз.
Даклады:
С. НЕКРАШЭВІЧ. Сучасны стан дасьледваньня беларускай мовы.
П. БУЗУК. Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў.
У клюбе Карла Маркса.
Увечары ад 5—8 гадз.
ЯЗЭП ЛЁСІК, П. РАСТАРГУЕЎ. Да рэформы беларускай азбукі.
У клюбе Карла Маркса.

Аўторак 16 лістапада:
Уранні ад 10—2 гадз.
ЯЗЭП ЛЁСІК, С. НЕКРАШЭВІЧ. Да рэформы беларускага правапісу.
У клюбе Карла Маркса.
Увечары ад 5—8 гадз.
Пасяджэньні Камісіяў па правапісе і графіцы.
У будынку Інстытуту Беларускай Культуры.

10

Серада 17 лістапада.
Уранні ад 10—2 гадз.
М. ПЯТУХОВІЧ. [illegible] у беларускай літаратуры.
М. ГАРЭЦКІ. Беларуская літаратура апошняга часу.
У клюбе Карла Маркса.
Увечары ад 5—8 гадз.
Пасяджэньні Камісіяў па правапісе і графіцы.
У будынку Інстытуту Беларускай Культуры.

Чацьвер 18 лістапада.
Уранні ад 10—2 гадз.
Л. ЦЬВЯТКОЎ. Беларускі элемэнт у польскай мове.
У клюбе Карла Маркса.
Увечары ад 5—8 гадз.
Пасяджэньні Камісіяў. Зачыненьне Конфэрэнцыі.

УВАГА. Члены Конфэрэнцыі, якія маюць даклады і хацелі-б іх зрабіць на конфэрэнцыі, будуць ласкавы зьвярнуцца аб гэтым у Прэзыдыум Конфэрэнцыі.

ца многія людзі. Іх лік невымерна вырас падчас масавых рэпрэсій 1937–1938 гадоў, калі знішчылі красу беларускай палітычнай эліты, нацыянальнай інтэлігенцыі.

Беларуская мова працягвала быць аб'ектам дзяржаўнай палітыкі і пасля таго, як улады па волі агульнасаюзнага партыйнага цэнтра вымушаны былі ўзяць курс на дэбеларусізацыю. З той толькі розніцай, што цяпер яны ўсяк імкнуліся павысіць сацыяльную ролю рускай мовы за кошт абмежавання функцый беларускай мовы. Улічваючы, што палітыку беларусізацыі падтрымалі шырокія колы людзей, у тым ліку і небеларускага паходжання, барацьбу з ёю нават і пасля расправы з «нацдэмамі» ўлады вялі асцярожна, каб асабліва не закрануць глыбінныя пачуцці карэннага насельніцтва рэспублікі: не так патрабавальна, як раней, ставіліся да валодання беларускай мовай асобамі пры прызначэнні на пасады, не спяшаліся пераводзіць на беларускую мову тыя ўчасткі, дзе яна яшчэ фактычна не стала дзяржаўнай. Падобнае ў значнай ступені было характэрна для вышэйшых навучальных установ галоўным чынам таму, што ў пачатку 1930-х гадоў нацыянальная структура і педагогаў, і студэнтаў не адпавядала такой структуры насельніцтва БССР у цэлым.

У той неспрыяльны час па ініцыятыве ўжо самой дзяржавы вялася праца над беларускім правапісам. Задума ў палітыкаў была такая: максімальна наблізіць яго да рускага, каб беларусы і рускія лепш разумелі адзін аднаго. Але ж дзеля гэтага набліжалі толькі беларускую мову да рускай, ні ў чым не закранаючы інтарэсаў апошняй. А гэта ўжо было не што іншае, як свядомая русіфікацыя самога беларускага правапісу. Распрацоўшчыкі правапісу з ліку нацыянальна свядомых людзей імкнуліся не даць адбыцца такому. Таму ўлады забракавалі ў 1930-м годзе падрыхтаваны праект правапісу нібыта з-за яго нацдэмаўскага характару. Быў істотна зменены склад распрацоўшчыкаў, усталяваны пільны нагляд над іх працай. Прычым даручылі ажыццяўляць яго і асобам, маладасведчаным у філалогіі.

У жніўні 1933 года СНК БССР зацвердзіў пададзены яму праект «Аб зьменах і спрашчэньні беларускага правапісу», які пазней сталі неафіцыйна называць «наркамаўскім». Асаблівых спрашчэнняў не назіралася, а вось страт адметнасцей беларускай мовы хапала. Самае ж страшнае, што новы правапіс адкрыў шырокія магчымасці для русіфікацыі самой беларускай мовы. Відаць, недарэмна неўзабаве пасля правядзення рэформы правапісу на пытанне «Што такое беларуская мова?» адказвалі: «Гэта сапсаваная руская мова».

На вялікую шкоду беларускай мове пайшло свядомае выкідванне рэдакцыямі выдавецтваў, газет і часопісаў з яе лексікі слоў нібыта польскага паходжання, хоць яны

Беларуская Думка

Источник: "Беларуская думка" - №3, 2016-03-18



маглі быць старабеларускімі ці запазычанымі з лацінскай, нямецкай ці іншых замежных моў. Партыйнымі ідэолагамі прапаноўвалася рэдактарам з двух аднолькавых па значэнні беларускіх слоў перавагу ў выкарыстанні аддаваць таму, якое мелася і ў рускай мове, з тым каб зрабіць гэтыя мовы як мага больш тоеснымі. Пісьменнікі і журналісты, выдаўцы, навучальныя ўстановы Заходняй Беларусі не прынялі рэформы, бо не жадалі ісці на руйнаванне ўласцівай беларускай мове адметнасці. У БССР жа ўлады вельмі пільна сачылі за захаваннем уведзеных рэформай правілаў.

Буйныя «дасягненні» ў барацьбе з беларускай мовай былі ў дзяржавы і на ўсіх іншых участках, але асабліва ў пераводзе на яе службовага справаводства партыйных і савецкіх органаў, наркаматаў і ведамстваў, педагагічнага працэсу сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. Апошнія так зрусіфікавалі, што перапужалі нават саюзнае кіраўніцтва. Па ўказанні апошняга ўлады рэспублікі пачалі даваць задні ход. А пужацца было з чаго, бо сярэдняя спецыяльная і вышэйшая школы ў рускай мове нават пры самым дасканалым прафесіяналізме, вялікім жаданні прафесарска-выкладчыцкага складу не ў стане былі рыхтаваць для Беларусі нацыянальную інтэлігенцыю. Такое магчыма толькі тады, калі педагагічны працэс у ССНУ і ВНУ адбываецца на беларускай мове. Масква не магла дазволіць сабе, каб у адной з саюзных рэспублік – Беларусі, да таго ж яшчэ і заходнім фарпосце СССР, адсутнічала нацыянальная інтэлігенцыя. Партыйным, савецкім органам давялося крута мяняць сваю нацыянальную палітыку ў сістэме адукацыі: пераходзіць ад інтэнсіўнай русіфікацыі да паступовай беларусізацыі. Менавіта на такую пераарыентацыю і была скіравана прынятая ў студзені 1941 года пастанова ЦК КП(б)Б «Аб вывучэнні беларускай мовы ў ВНУ, тэхнікумах і школах БССР». У ёй востра крытыкавалі кіраўнікоў органаў народнай асветы, ВНУ, тэхнікумаў і агульнаадукацыйных школ за істотнае абмежаванне маштабаў выкарыстання беларускай мовы ў навучальна-выхаваўчым працэсе, за амаль поўнае выключэнне яе са зносін педагогаў з вучнямі, са службовага справаводства. Такое безнадзейнае становішча беларускай мовы ў сферы асветы Бюро ЦК КП(б)Б назвала грубейшай памылкай, «прапанавала абкамам, гаркамам і райкамам партыі да 10 лютага правесці нарады сакратароў партарганізацый, дырэктараў ВНУ, тэхнікумаў і сярэдніх школ, на якіх меркавалася разгледзець пытанне аб выкладанні прадметаў на беларускай мове» *[7, с. 209]*. Да ўдзелу ў вырашэнні гэтай архіскладанай праблемы не падключалі бацькоў школьнікаў і студэнтаў, бо далёка не ўсе яны разумелі сапраўдную ролю беларускай мовы ў школе, ССНУ і ВНУ, дзе якраз і адбываецца гістарычнай важнасці працэс фарміравання нацыянальна свядомых маладых пакаленняў беларускага народа, чаго ніяк нельга ажыццявіць на чужой культурна-моўнай аснове, хоць нават у чымсьці і блізкай яму. Развязаная фашысцкай Германіяй вайна супраць СССР не дазволіла яшчэ раз паспрабаваць перавесці сістэму народнай адукацыі на нацыянальны грунт.

Найскладанае становішча беларускай мовы ва ўсе пасляваенныя гады і ў нашы дні абавязвала і абавязвае дзяржаву да забеспячэння ёй самых шырокіх магчымасцей для выкарыстання ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека. Раскрыццё гэтай архіактуальнай праблемы пакідаю іншаму аўтару, а то, з-за яе празмернай складанасці, – і цэламу калектыву аўтараў. Не адкрыю сакрэту, калі напішу, што беларуская мова амаль пагалоўна сышла з вуснаў людзей. Сышла не па іх волі, а ў выніку не аднаго стагоддзя скіраванай на гэта дзяржаўнай палітыкі. Яе належыць карэнным чынам змяніць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Практическое разрешение национального вопроса в Белорусской Социалистической Советской Республике: по материалам Национальной комиссии ЦИК БССР. – В 2 ч. – Ч. 1: Белорусизация. – Минск, 1927. – 367 с.
2. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: сборник документов / Институт истории партии при ЦК КПБ – филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; под общ ред. В.И. Бровикова (пред. ред.) [и др.]. – Т. 1: 1918–1927. – Минск, 1983. – 527 с.
3. Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху: калектыўная праца пад агульнай рэдакцыяй А. Сташэўскага, З. Жылуновіча і У. Ігнатоўскага з дапамогай А. Смоліча, С. Некрашэвіча і Я. Пятровіча. – Менск: Выд. ЦВК БССР, 1924. – 323 с.
4. Сінькова, Л.Д. Размаўляючы з Іванам Навуменкам / Л.Д. Сінькова // Творчая асоба І. Навуменкі і праблемы беларускай філалогіі і адукацыі: зб. навук. артыкулаў; рэдкал.: Т.І. Шамякіна (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 75–85.
5. Резолюции пленума ЦК КП(б)Б (приняты 6–9 июля 1924). – Менск, 1924.
6. Савецкая Беларусь. – 1924. – № 11.
7. Андрэева, Е.Г. Гісторыя народнай адукацыі Беларусі (1917–1941) / Е.Г. Андрэева. – Мінск, 2001. – 315 с.